УДК 94(4)|1939/1945|(470.41)

***Грыбава С.У.***

# УКЛАД ТАТАРСКА-МУСУЛЬМАНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРАМОГУ НАД ВОРАГАМ ПАДЧАС ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Татарска-мусульманскае насельніцтва нашай краіны разам з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей змагалася супраць ворага ў часы Другой сусветнай вайны як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі.

Беларускія татары вялі барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў складзе розных вайсковых фарміраванняў на франтах вайны. Асноўная частка татарскага насельніцтва Беларусі змагалася ў складзе Чырвонай Арміі. Так як адзначаны аспект антыфашысцкай барацьбы ўжо прадстаўлены аўтарам у навуковых публікацыях [1; 2], у дадзеным артыкуле будзе рагледжаны ўдзел мясцовых татараў у іншых вайсковых фарміраваннях на франтах Другой сусветнай вайны.

Пачалі яны змагацца з ворагам у верасні 1939 г. пасля нападзення нямецка-фашысцкіх войскаў на Польшчу: вялі барацьбу супраць пераўзыходзячых сіл праціўніка ў складзе татарскага ўланскага эскадрона 13-га палка віленскіх уланаў у Польскай арміі. Месцам дыслакацыі эскадрона была Новая Вілейка непадалёку ад Вільні. Татары Заходняй Беларусі з'яўляліся рэзервам для фарміравання ўланскага эскадрону. Напрыклад, у перадваенны час службу ў эскадроне неслі татары з Клецку: Якуб Казакевіч, Мустафа Абрамовіч і яго брат Бекір. Камандзірам эскадрона ў той час быў татарын, ротмістр Аляксандр Ельяшэвіч, а капеланам (мусульманскім святаром) – ураджэнец Ляхавіч варшаўскі імам Алі Варановіч. 13-ты полк віленскіх уланаў уваходзіў у 3-ю віленскую брыгаду кавалерыі, у складзе якой таксама знаходзіўся полк гродзенскіх уланаў [3, с. 2].

За тыдзень да пачатку вайны ў палку была аб'яўлена мабілізацыйная гатоўнасць. 27 жніўня 1939 г. віленская брыгада атрымала загад пачаць перадыслакацыю ў раён Піётркува Трыбунальскага у раёне Чэнстаховы. Татарскі эскадрон уланаў, у якім налічвалася каля 50 мусульман, у канцы жніўня быў пагружаны ў таварныя вагоны разам з коньмі і чыгункай накіраваны на фронт праз Ліду, Баранавічы, Брэст, Варшаву, Лодзь у раён Піётркува Трыбунальскага.

Першы тыдзень вайны эскадрон і ўвесь 13-ты полк уланаў знаходзіўся ў лесе паміж станцыямі Галкув і Юстынаў. Перад палком стаяла задача ўтрымліваць наступленне праціўніка, для таго каб пяхота змагла адыйсці на іншыя пазіцыі. Пакінуўшы коней у вёсках і на ўзлесках і акапаўшыся, яны з дапамогай лёгкіх гармат і кулямётаў вялі бой з праціўнікам, які спрабаваў прарваць лінію абароны. Увесь час полк знаходзіўся ў полі зроку фашысцкай разведвальнай авіяцыі і рэдкіх абстрэлаў артылерыі [4, с. 100].

Першы бой з праціўнікам адбыўся 3 верасня 1939 г. за Піётркувам, дзе эскадрон трапіў у акружэнне танкаў ворага. У выніку большасць салдат адступіла да месца знаходжання сваіх коней, частка загінула або трапіла ў палон. Эскадрон адышоў у бок Радома, дзе ўз'яднаўся з 13-м палком і пачаў адступленне за раку Пііцу, каб арганізаваць абарону пераправы ў Сулеёве.

7 верасня 1939 г. эскадрон даў бой моцнаму механізаванаму атраду ворага, затрымаўшы яго наступленне. Аднак пасля страты сувязі камандавання 13-га палка з камандаваннем брыгады і неаднаразовых налётаў авіяцыі ворага і пад напорам яго танкава-механізаваных злучэнняў пачаўся перыяд агульнага адступлення разбітай Польскай арміі да адзінага маста праз раку Віслу ў раёне Мацяёўцаў. Тут, папаўшы пад бомбавыя ўдары авіяцыі праціўніка, армія панесла вялікія страты. Многа салдат і коней было патоплена, забіта і паранена. Пасля пераправы на ўсходні бераг Віслы ротмістр Алі Ельяшэвіч сабраў толькі частку ўланаў. Віленская брыгада кавалерыі перастала існаваць як баявая адзінка. Татарскі эскадрон далучыўшыся да 4-га палка, рухаўся далей на поўнач, прымаючы ўдзел у асобных сутычках з ворагам [5, с. 126].

Пасля ўступлення Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, кавалерыйская брыгада правяла бой з аховай нямецкай калоны, пасля якога захапіла ў палон некалькі салдат і аўтамабіляў ворага. Аднак 23 верасня 1939 г. пасля цяжкіх баёў з 68-й пяхотнай германскай дэвізіяй, якую падтрымлівала артылерыя і мінамёты, полк быў разбіты, і ад зводнага татарскага эскадрона засталося толькі два дзесяткі салдат. Некаторыя з іх, страціўшы сувязь з камандзірам эскадрона, спрабавалі самастойна прарывацца на ўсход. Частка – перайсці ў Венгрыю, другая частка асобнымі групамі працягвала змагацца з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Рэштка ўланаў рухалася ў накірунку Любліна, Хелма і Ковеля, таму што далейшае супраціўленне страціла сэнс.

Многіх салдат, у тым ліку згаданых Мустафу Абрамовіча і Якуба Казакевіча з Клецка, чырвонаармейцы затрымалі і накіравалі на станцыю Івацэвічы, дзе фарміраваўся эшалон для ваеннапалонных. Праз некалькі дзён эшалон рушыў на ўсход [3, с. 3]. Гэта быў перыяд, калі пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў верасні 1939 г. пачаліся ганенні супраць былых ваеннаслужачых Польскай арміі, польскіх чыноўнікаў, заможных сялян, святароў і іншых катыгорый насельніцтва, якія арыштоўваліся і дэпартаваліся ў Сібір і іншыя аддаленыя рагіёны СССР. Магчыма, таму пры сустрэчы з Чырвонай Арміяй нават радавыя салдаты Польскай арміі не вызваляліся, а накіроўваліся ў лагеры ваеннапалонных у Казельск, Старабельск і Асташкава.

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны і зменай палітычнай сітуацыі ў свеце змянілася і становішча польскіх палонных. Паводле пагаднення паміж савецкім і польскім эміграцкім урадамі ў ліпені 1941 г. на тэрыторыі СССР з бежанцаў, палонных і іншых польскіх грамадзян у верасні 1941 г. пачала фарміравацца польская армія пад камандаваннем генерала У. Андэрса. У гэтую армію таксама ўступілі татары з Заходняй Беларусі, якія знаходзіліся ў лагерах для ваеннапалонных ці былі дэпартаваны на Усход. У яе складзе апынуліся згаданы Мустафа Абрамовіч з Клецка, Джанура Байрашэўская са Слоніма (дачка палкоўніка Мацея Байрашэўскага, сям'я якога, як польскага асадніка, была дэпартавана), былы асаднік з Нясвіжскага раёна Баранавіцкай вобласці Смайкевіч Рамуальд (дэпартаваны з сям'ёй у Архангельскую вобласць).

Але пасля няўдалых перамоваў с І. Сталіным эміграцкі польскі ўрад у 1942 г. выступіў супраць удзелу польскіх войскаў на савецка-германскім фронце. Таму па яго загаду генерал У. Андэрс у сакавіку-жніўні 1942 г. павінен быў вывесці амаль усю армію (каля 75 тыс. чалавек) з СССР у Іран. Там іх сустрэлі англійскія войскі, пераабмундзіравалі і накіравалі ў Ірак і Палесціну на пераадукацыю з выкарыстаннем англійскага ўзбраення. Затым у 1944 г. яны вярнуліся ў іранскі порт на беразе Пярсіцкай затокі і адтуль параходам былі накіраваны ў Егіпет і Італію (Монтэ-Касіна), дзе прымалі ўдзел у баях з фашыстамі [4, с. 100].

Беларускія мусульмане прыўнеслі свой уклад у агульную перамогу над ворагам, змагаючыся ў шэрагах І-й пяхотнай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі. Яна была сфарміравана Саюзам польскіх патрыётаў пры падтрымцы савецкага ўрада і стала асновай І-й Польскай арміі, створанай 16 сакавіка 1944 г. пад камандаваннем генерала З. Берлінга. У пяхотную дывізію трапілі многія польскія салдаты, якія не паехалі ў Іран у складзе арміі У. Андэрса, а таксама дэпартаваныя на Усход былыя польскія асаднікі. Прайшоўшы

***Грибова Светлана Владимировна***, *ст. преподаватель кафедры социально-политических и исторических наук Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*

Репозиторий БрГТУ

невялікі курс падрыхтоўкі, польская дывізія і 1-шы танкавы полк імя герояў Вестэрплятэ ўпершыню 12–13 кастрычніка 1943 г. уступілі ў бой з фашысцкімі войскамі каля в. Леніна Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. За два дні цяжкіх баёў было знішчана амаль 2,5 тысяч гітлераўцаў, шмат баявой тэхнікі праціўніка. Але і польская дывізія панесла значныя страты. Сярод загінуўшых былі і татары. У даведцы Генеральнага штаба Міністэрства абароны Польшчы ад 14 ліпеня 1949 г. паведамлялася, што «радавы Карыцкі Аляксандр, сын Давыда, народжаны 20 снежня 1924 г. у г. Клецку, Навагрудскага ваяводства, мабілізаваны на вайсковую службу Нейскім РВК Яраслаўля, геройскі і мужна змагаўся за свабоду і незалежнасць краіны. Загінуў 12 кастрычніка 1943 г.» [6, s. 81]. Удзельнічаў у гэтым баі ў складзе І-й пяхотнай дывізіі, ІІ-га стралковага палка ўраджэнец Слоніма татарын Энвер Байрашэўскі (1924 г.н.) (сын Мацея Байрашэўскага – палкоўніка, ваеннага асадніка, сям'я якога была дэпартавана ў Валагодскую вобласць). Аднак яго лёс склаўся не так трагічна. Старэйшы сяржант Энвер Байрашэўскі змагаўся з ворагам да 1944 г. Меў узнагароды. Пасля вайны жыў у Польшчы [7].

Як і абсалютная большасць беларусаў, іх суайчыннікі-татары таксама адмоўна ставіліся да карных акцый фашыстаў у дачыненні да яўрэйскага насельніцтва і не раз ў цяжкую хвіліну прыходзілі яму на дапамогу, рызыкуючы ўласным жыццём. Да сённяшняга часу гісторыя захавала эпізоды, якія сведчаць аб іх высокай маральнасці. Так, у кватэры Т.Я. Якубоўскай з зімы 1941–1942 г. па восень 1942 г. знаходзіліся жанчына з дзяўчынай, якіх папрасіў схаваць вядомы мінскі падпольшчык М.П. Дрозд (бацька аднакласніцы Т.Я. Якубоўскай Яніны Дрозд). З успамінаў Т.Я. Якубоўскай становіцца вядомым, што ў жанчыны былі дакументы, якія сведчылі аб тым, што яна руская. Таісія Якаўлеўна ўспамінае: «Мікалай Пракаповіч казаў мне: "Мы яе прапішам, а калі хто будзе пытаць – адказвай, што яна – Алена Антонаўна, а дзяўчынка – Шура, прапісаны ў гарадской управе, і адкуль мне ведаць, што яна і хто яна". Потым у Мікалая Пракаповіча з'явілася магчымасць, і ён пераправіў яе ў партызанскі атрад» [8, с. 61–62]. У мястэчку Смілавічы сучаснага Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці Фаціма Хасенеўна і Танзіля Адамаўна Ясінскія ўратавалі і выхавалі трох яўрэйскіх дзяцей: Марата, Гену і Малку, маці якіх загінула ў Пухавіцкім гета [9, с. 222–223]. Знайшла прытулак у сям'і ўздзенскай татаркі Міні Аляксандраўны Хасяневіч яўрэйка Галіна Яфімаўна Кульчаева [10, с. 179]. Дарэчы, немцы, ствараючы гета ва Уздзе, сялілі яўрэяў у татарскія хаты па вуліцах Пралетарскай, Ленінскай і Кастрычніцкай, а татараў перасялялі ў хаты, дзе жылі яўрэі.

Асобна трэба звярнуць увагу на постаці Фацімы Мустафаўны Канапацкай (1891–1985) і Ганны (Айшы) Сулейманаўны Канапацкай-Трафімавай (1926 г.н.) з Мінска, якім Ізраільскі Мемарыяльны музей памяці ахвяр і герояў Катастрофы еўрапейскага яўрэйства «Яд-Вашэм» (Іерусалім) у снежні 2003 г. надаў званне «Праведнікаў народаў свету» з уручэннем дыпломаў і медалёў. Фаціма і яе дачка Ганна (Айша) перапраўлялі ў мінскае гета прадукты, якія здабывалі ў заходніх абласцях краіны, абменьваючы розныя рэчы. Дзякуючы іх намаганням цэлая яўрэйская сям'я Давідсонаў выжыла падчас германскай акупацыі. Фрума і Ізраіль Давідсоны пасля акупацыі з трыма дзецьмі трапілі ў гета, адкуль Ізраіля перавялі ў лагер у Драздах. Уцякаючы з лагера, ён быў паранены і, сыходзячы крывёй, прыйшоў да сваіх былых суседзяў Канапацкіх. Фаціма і Ганна дапамаглі Ізраілю залячыць раны, пасля чаго ён вярнуўся да сям'і ў гета, дзе Давідсоны перажылі тры пагромы [11, с. 143].

У чэрвені 1942 г. Ізраіль зноў прыйшоў да Канапацкіх, дзе хаваўся цэлы год. Ганна ўспамінае наступнае: «Ізраіль, муж Фрумы, даўняй знаёмай маці, пасяліўся ў нас. У хляву ён выкапаў яму-нару, замаскіраваў яе дровамі і пражыў там цэлы год. Немцы лютавалі бязмерна. Праводзілі аблаву за аблавай. У адну з такіх аблаў трапіла і наша вуліца. Да нас прыйшлі з праверкай, нічога не знайшлі і пайшлі. Тайнік, у якім хаваўся Давідсон, не знайшлі, таму што дровы не чапалі. Толькі мы з маці ўздыхнулі з палёгкай, як прыйшлі другія, ужо эсэсаўцы. Салдаты пачалі правяраць хлеў, а афіцэр зайшоў у дом, дзе яго ўвагу прывабіў комін. Стаўшы на табурэт, ён палез рукой у адтуліну коміна. Справа гэта не вельмі чыстая і ён рабіў яе з вялікім незадавальненнем. На шчасце, я здагадалася сказаць, што ў нас ужо была адна праверка. Ён, як мне падалося, узрадаваўся, саскочыў з табурэта, выйшаў, паклікаў сваіх салдат (а яны ўжо пачалі разбіраць дровы) і павёў іх. Не трэба мець вялікага ўяўлення, каб ўявіць, што чакала нас, ды і ўсю Татарскую вуліцу, знайдзі яны Давідсона. Роўна год прасядзеў ён у сваёй нары, выходзячы ноччу падыхаць, ды яшчэ ў зіму глыбокай ноччу мы пускалі яго ў дом на некалькі гадзін, каб ён не замёрз. <...> Дзеці Давідсонаў – Рахель (1933 г.н.), Міра (1935 г.н.), Вова (1938 г.н.) часта ўцякалі з гета і прыходзілі да нас. Маці чым магла дапамагала ім» [12, с. 59–60]. У чэрвені 1943 г., калі над мінскім гета навісла пагроза поўнага знішчэння, уся сям'я Давідсонаў уцякла і прыйшла да Канапацкіх. Прабыўшы ў сваіх выратавальнікаў суткі і зразумеўшы, што месца для пяці чалавек не хапае, яны накіраваліся на пошукі партызан і знайшлі іх.

Дарэчы, Ганна Канапацкая ў 1944 г. апынулася ў канцлагеры за сувязь з партызанамі, была накіравана ў Кёнігсберг, падвяргалася допытам. Пасля вайны была вызвалена. У пасляваенныя гады яна скончыла медыцынскае вучылішча, працавала лабарантам. Разам з маці жыла ў Мінску. Сям'я Давідсонаў пасля вызвалення Мінска вярнулася ў горад. Фаціма і Ганна Канапацкія доўгі час падтрымлівалі з імі сяброўскія адносіны [9, с. 220]. Так, у складаных умовах татальнага вынішчэння яўрэйскага народа беларускія татары дапамагалі ім ратавацца. Імёны Фацімы Канапацкай і яе дачкі Ганны (Айшы) выбіты на Сцяне гонару на Алеі праведнікаў Мемарыяльнага музея катастрофы і гераізму еўрапейскага яўрэйства «Яд-Вашэм» у Іерусаліме.

Трэба звярнуць увагу і на Розу Сцяпанаўну Радкевіч – актыўнага змагара супраць акупантаў спачатку ў падполлі, а потым і ў партызанскім руху. Яна нарадзілася ў 1906 г. у м. Вішнева Вілейскай вобласці. У якасці яе хатняга адрасу ў дакументах згадваецца г. Мінск, вул. МОПРа, 119, кв. 7 [13, л. 101–102], а таксама м. Карэлічы. Р.С. Радкевіч мела сярэднюю адукацыю, у 1934 г. скончыла рабфак [14, л. 194]. З 1938 г. з'яўлялася членам ВКП(б)Б. Да вайны займала пасаду інструктара Брэсцкага ГК КП(б)Б [15, л. 105–106]. У складзе Брэсцкага падполля вяла барацьбу з ворагам са жніўня 1941 г. Аднак летам 1942 г. па даносу фашысты правялі масавыя арышты падпольшчыкаў горада. Рэпрэсіям былі падвергнуты 15 сем'яў у складзе 60 чалавек, якія жылі па вуліцах Беластоцкай, Савецкай, Топалева. 20 жніўня 1942 г. на кватэру, дзе жылі Р.С. Радкевіч і А.М. Бабушкіна (намеснік старшыні антыфашысцкага камітэта, створанага па рашэнні бюро Брэсцкага гаркама партыі восенню 1941 г. – *С.Г.*) уварваліся фашысты. «Пачалася праверка дакументаў, – успамінае А.М. Бабушкіна. – Я прад'явіла пашпарт на дзявочае прозвішча А.М. Ханенка, а Р.С. Радкевіч – Мількамановіч. Прад'явілі дамавую кнігу, дзе нашы сапраўдныя прозвішчы таксама не значыліся. Пакуль немцы наводзілі даведкі ў суседзяў, мы здолелі сысці з кватэры, папярэдзіўшы аб гэтым маці З.І. Паўднёвай (З.І. Паўднёвая – старшыня антыфашысцкага камітэта. – С.Г.). Так мы з Розай Сцяпанаўнай пакінулі Брэст» [16, с. 72].

А.М. Бабушкіна і Р.С. Радкевіч з дачкой Марыяй накіраваліся ў Навагрудак Баранавіцкай (сучаснай Гродзенскай) вобласці да роднага Розы Сцяпанаўны Якуба Радкевіч-Шчасновіча, таксама татарына па нацыянальнасці. Жылі нелегальна. Знайшлі сувязь з партызанамі, якія дзейнічалі каля м. Гарадзішча Баранавіцкай (сучаснай Гродзенскай) вобласці. У верасні 1942 г. перайшлі ў Гарадзішча. Жылі ў татаркі Марыі Ждановіч, якая паспрыяла іх знаёмству з сувязным партызанскага атрада імя 1-га Мая Іванам Сапега. З дапамогай другой сувязной, сястры Івана Захаравіча Вікторыі Сапега, выйшлі на намесніка камандзіра партызанскага атрада імя 1-га Мая па разведцы А.І. Крутава. А.І. Крутаў ад імя камандавання (камандзір І.Я. Чумачэнка, камісар С.Д. Лапацкі) прапанаваў жанчынам у Гарадзішчы ўладкавацца на працу да акупантаў і інфармаваць партызан аб дыслакацыі гітлераўскіх войскаў, аб іх узбраенні, задумах фашыстаў супраць партызан і мясцовага насельніцтва, а таксама весці агітацыйна-прапагандысцкую працу сярод жыхароў мястэчка, дастаўляць у партызанскі атрад боепрыпасы і медыкаменты.

Репозиторий БрГТУ

Так, Роза Сцяпанаўна працавала на карысць атрада ў якасці агентурнага разведчыка, знаходзячыся ў Гарадзішчы. Яна ўладкавалася на працу ў гарадзішчанскую паліцыю поварам. У Гарадзішчы акрамя паліцэйскага паста размяшчаўся 57-мы знішчальны гарнізон, які складаўся з уласаўцаў. Падпольшчыцам удалося перацягнуць на свой бок пяць паліцэйскіх, ад якіх яны сістэматычна атрымлівалі неабходную інфармацыю і праз Вікторыю Сапега перадавалі ў партызанскі атрад. З ліку ўласаўцаў таксама завербавалі аднаго чалавека, з дапамогай якога набывалі зброю і звесткі аб планах гарнізона.

З-за арышту фашыстамі 11 верасня 1943 г. Вікторыі Сапега Р.С. Радкевіч і А.М. Бабушкіна пайшлі ў партызанскі атрад імя 1-га Мая, які на той момант быў ужо ў складзе Першамайскай брыгады. Яна была створана ў маі 1943 г. і дзейнічала у Карэліцкім, Новамышскім, Гарадзішчанскім, Навагрудскім і Мірскім раёнах Баранавіцкай вобласці [16, с. 73]. З кастрычніка 1943 г., уступіўшы ў партызанскі атрада імя 1-га Мая, Роза Сцяпанаўна ўдзельнічала ў баявых аперацыях. Яна была выбрана членам Карэліцкага падпольнага райкама партыі, а з 15 лістапада 1943 г. – сакратаром партарганізацыі атрада. Гэтую пасаду яна займала да 10 ліпеня 1944 г. – да моманту злучэння брыгады з Чырвонай Арміяй [14, л. 194]. Фактычна ўсю арганізацыйна-агітацыйную працу ў атрадзе і сярод насельніцтва ўзначальвала Роза Сцяпанаўна. 27 снежня 1943 г. рашэннем Баранавіцкага падпольнага абкама КП(б)Б яна была зацверджана членам бюро Карэліцкага падпольнага райкама партыі і рэдактарам падпольнай газеты «Чырвоны партызан». Над газетай яна працавала адна. Выпусціла 13 яе нумароў, 49 баявых ліcткоў, некалькі лістовак [16, с. 73]. За сваю актыўную дзейнасць у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі Р.С. Радкевіч была прадстаўлена да ўзнагароды ордэнам Чырвонай Зоркі [14, л. 194]. Пасля вызвалення ад акупантаў яе абралі сакратаром Карэліцкага райкама партыі [16, с. 73].

Акрамя брэсцкага падполля, прадстаўнікі татарска-мусульманскага насельніцтва Беларусі змагаліся з ворагам таксама ў складзе ўздзенскага і мінскага падполля (у апошнім, дарэчы, яны былі прдстаўлены ў найбольшай колькасці). Прымалі ўдзел ў падпольным руху і капыльскія татары. Аднак пасляваеннага прызнання капыльскае падполле не атрымала.

На акупаванай тэрыторыі БССР мясцовыя татары змагаліся з ворагам і ў якасці партызан, часам нават цэлымі сем'ямі. Беларускія татары ўдзельнічалі ў антыфашысцкай барацьбе ў складзе 64 партызанскіх фарміраваннях (32 партызанскіх атрада, 29 партызанскіх брыгад, 2 асобных атрада і 1 партызанскі полк). Камандзірскіх пасад яны, за рэдкім выключэннем, не займалі. Па дадзеных аўтара, не менш 17 % з ліку татараў-партызан атрымалі ўрадавыя ўзнагароды за ўклад у агульную перамогу над ворагам. Прадстаўніцтва беларускіх татараў у партызанскіх фарміраваннях усходніх абласцей Беларусі склала каля 2 % з ліку татарскага насельніцтва дадзенага рэгіёну. Беларускія татары ў брыгадах партызанскіх злучэнняў заходніх абласцей БССР былі прадстаўлены меншай колькасцю: каля 0,6 % татарскага насельніцтва вызначаных абласцей вяло барацьбу ў складзе згаданых партызанскіх фарміраванняў. Увогуле, у партызанскім руху змагалася не меней 1 % беларускіх татараў ад агульнай колькасці татарскай супольнасці БССР.

Такім чынам, падчас вайны беларускія татары прынялі непасрэдны ўдзел у антыфашысцкай барацьбе. На тэрыторыі рэспублікі яны змагаліся ў партызанскім руху, у падполлі, ратавалі яўрэяў ад вынішчэння, рызыкуючы ўласным жыццём. Мясцовыя татары прыўнеслі свой уклад у агульную перамогу над ворагам і змагаючыся ў складзе розных вайсковых фарміраванняў на франтах ***Другой сусветнай*** вайны. На пачатку вайны яны былі прадстаўлены ў 13-м палку віленскіх уланаў у складзе Польскай арміі, затым у арміі У. Андэрса, І-й польскай дывізіі імя Тадэвуша Касцюшкі, якая паклала аснову І-й Польскай арміі, аднак большасць татараў змагалася ў падраздзяленнях Чырвонай Арміі.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ**


1. Грыбава, С.У. Прадстаўнікі Іўеўскай татарскай абшчыны на франтах Другой сусветнай вайны / С.У. Грыбава // материалы XI Респ. науч.-метод. конф. молодых ученых, Брест, 15 мая 2009 г.: в 2 ч. / Брест. гос. ун-т им. А.С. Пушкина; под общ. ред. К.К. Красовского. – Брест, 2009. – Ч. 2. – С. 82–85.
2. Грыбава, С.У. Беларускія татары на франтах Вялікай Айчыннай вайны / С.У. Грыбава // Вышэйшая школа. – 2009. – № 4. – С. 59–63.
3. Александрович, Х.М. Татары в книгах «Память» районов их проживания / Х.М. Александрович // Жизнь, Жыццё татарскае. – 2003. – № 5. – С. 2–3.
4. Канапацкі, І.Б. Да пытання ўдзелу мусульман у барацьбе беларускага народа супраць фашысцкіх захопнікаў у гады Другой сусветнай вайны / І.Б. Канапацкі // Вызваленне Беларусі ад германскіх акупантаў (восень 1943 – лета 1944 гг.): матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 29 крас. 2004 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 99–105.
5. Александрович, Х.М. Татары клецкого джамията в годы Второй мировой войны / Х.М. Александрович // Участие тюркских народов и народов Кавказа в Великой Отечественной войне 1941–1945 гг. : материалы X междунар. науч.-практ. конф., Минск, 2–3 сент. 2004 г. / Белорус. гос. пед. ун-т; редкол.: И.Б. Канапацкий [и др.]. – Минск, 2004. – С. 124–149.
6. Aleksandrowicz, Ch. Ksiega pamieci. Z okazji 60-lecia wyzwolenia Bialorusi, z wyciestwa w Wielkiej wojnie ojczyznianej i 120-lecia pierwszego meczetu w Klecku / Ch. Aleksandrowicz // Rocznik tatarow Polskich. – 2006. – № 11. – S. 69–107.
7. Archiwum Fundacji Osrodka KARTA, Indeks Represjonowanych w Warszawe. (Опросные листы, заполненные репрессированными лицами или членами их семей. IR-10262.).
8. Нікалайчык, Т.Я. Тое, што помніцца / Т.Я. Нікалайчык // Байрам. – 1994. – № 4. – С. 61–63.
9. Канапацкі, І.Б. Удзел татараў у Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі Беларусі / І.Б. Канапацкі // Народы СССР в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. (к 60-летию Победы советского народа в Великой Отечественной войне): материалы XI Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 30–31 мая 2005 г. / Белорус. гос. пед. ун-т; редкол.: З.И. Канапацкая [и др.]. – Минск, 2006. – С. 263–278.
10. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Уздзенскага раёна / Рэдкал.: Г.К. Кісялеў [і інш.]. – Мінск: БЕЛТА, 2003. – 656 с.
11. Праведники народов мира Беларуси / Международный центр культурных связей «Израиль-Беларусь», Музей истории и культуры евреев Беларуси; сост. И. Герасимова [и др.]. – Минск: Тонпик, 2004. – 162 с.
12. Трафімава (Канапацкая), А. Да 50-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне / А. Трафімава (Канапацкая) // Байрам. – 1994. – № 4. – С. 58–60.
13. Первомайская бригада, Барановичская обл. (1942–1944 гг.) // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 406.
14. Личные дела командного состава. С фамилии Раберман по фамилию Разуваев // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 1450. – Воп. 8. – Спр. 205.
15. Документы о расформировании Первомайской бригады Барановичской области (удостоверения, справки, списки), сведения о количестве раненых, партизан, представленных к правительственным наградам, списки партизанской бригады и погибших бойцов (2 октября 1943 г. – 19 июня 1944 г.) // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 1399. – Воп. 1. – Спр. 572.
16. Гребенкина, А.А. Брест непокоренный. Антифашистское подполье г. Бреста и Брестского района в годы Великой Отечественной войны / А.А. Гребенкина. – Минск: БелЭН, 2005. – 328 с.


*Материал поступил в редакцию 28.10.13*

Репозиторий БрГТУ

**GRIBOVA S.V. Contribution of the Tatar and Muslim population of Belarus to a victory over the enemy during World War II**

This article is about antifascist struggle of the Belarusian Tatars during the World War II. On the basis of the archive data the author presents information on the number of Tatar population who participated in the partisan movement. The author brings examples of faithful struggle of the Belarusian Tatars in the underground movement. The attention is drawn to the fact the attitude of the local Tatars to the fate of the Jewish population was not indifferent. It's also noted in the article that the Belarusian Tatars fought the enemy on the fronts of the war, most of them were included in the units of the Red Army. The Belarusian Tatars also fought the enemy in the 13th Regiment of the Vilnius Lancers in the Polish army, then in the army V.Anders, 1th Polish division named after Tadeusz Kosciuszko, which laid the foundation for the 1th Polish army.

УДК 330.8 (476)

***Ковалёва Н.Н.***

# СПЕЦИФИКА ХОЗЯЙСТВЕННОГО РАЗВИТИЯ БРЕСТСКОГО УЕЗДА В КОНЦЕ XIX – НАЧАЛЕ XX ВВ.

**Введение**. В исследуемый период Брестский уезд являлся одним из шести белорусских уездов Гродненской губернии (в ее состав входили также три уезда, территория которых сейчас – в составе Республики Польша). Для хозяйственного развития Брестского уезда были характерны те же тенденции, что и для губернии в целом. Однако развитие сельского хозяйства и промышленности уезда имело свою специфику, обусловленную природно-географическими факторами и особенностями геополитического положения. В данной статье нами предпринимается попытка выявить эту специфику и определить место уезда в экономике региона.

В Республике Беларусь осуществлялись исследования экономики конца XIX – начала XX вв., однако региональные особенности отдельных территорий практически не изучены. Попытка анализа экономики Брестского региона в указанный отрезок времени предпринимается впервые.

Главным занятием жителей Брестского уезда в пореформенный период, как и населения других белорусских уездов Гродненской губернии, было земледелие, что предопределялось преобладанием равнинного ландшафта. В уезде практически не было болот, хотя в губернии болота занимали 1/15 (по другим данным – 1/20) часть территории. Отсутствовали большие лесные массивы, пригодные для промышленного использования, хотя часть территории уезда занимала Беловежская пуща. Если Гродненская губерния в целом отличалась самыми плодородными в Северо-Западном крае почвами, то Брестский уезд имел почву песчаную, малоплодородную, требующую тщательного удобрения. Занимая среди шести белорусских уездов губернии второе место (после Слонимского) по общей площади (4223 кв. версты или 438 451 десятины), уезд в 60-е годы XIX века находился лишь на пятом месте по численности населения (90 340 человек) [1, с. 58].

Плотность населения в уезде составляла лишь 49 человек на 1 кв. версту используемой площади, что было далеко от показателей аграрной перенаселенности. По данным М.В. Довнар-Запольского, под аграрной перенаселенностью для Беларуси следует считать число от 73 до 86 душ на 1 кв. версту, причем «перенаселённость надо понимать относительно – в смысле охвата населением всей территории, пригодной для сельскохозяйственного использования при данной сельскохозяйственной технике» [2, с. 18].

Несмотря на сравнительно небольшую плотность населения, пахотная земля после реформы оказалась распределенной крайне неравномерно, поэтому главной проблемой крестьянских хозяйств оставалось малоземелье (четвертая часть крестьян Гродненской губернии получила надел размером всего 3–4 десятины) и чересполосица. В 1863 г. в руках у помещиков оставалось более 148 137 десятин удобной земли, а в руках временно обязанных крестьян – всего 115 248 десятин [3]. В условиях крестьянского малоземелья даже при небольшой плотности населения проблема аграрной перенаселенности для Брестского уезда могла бы приобрести значительную остроту, если бы не наметившееся превращение Брест-Литовска в промышленный центр, готовый принять избыточное количество рабочих рук. В последующие годы тенденция роста крестьянского землевладения в Брестском уезде проявилась столь же позитивным образом, как и в целом по Гродненской губернии. К 1886 году значительная часть земли – 185 555 десятин (45%) – перешла в руки крестьян, 170 986 десятин земли оставалось в руках помещиков (42%) и 51 749 десятин – в ведении Министерства государственного имущества (13%) [4], а к 1913 г. в руках помещиков оставалось 91 155 десятин земли [5]. Рост крестьянского землевладения и благоприятное изменение демографической ситуации (к 1897 г. в уезде проживали уже 218 432 человека [6]) стали важными факторами интенсификации хозяйства региона к концу XIX в.

В пореформенный период уезд специализировался на производстве зерновых культур. Урожайность основных сельскохозяйственных культур была ниже, чем в других уездах губернии, в силу низкой плодородности почвы. Недостаток средств у помещиков препятствовал внедрению усовершенствованных орудий труда и прогрессивной системы земледелия (повсюду использовалась трёхпольная система, а не более прогрессивная плодопеременная). К тому же слаборазвитое животноводство не могло дать необходимого количества удобрений. Исследователи считают, что для удобрения одной десятины пашни необходимо 10 голов скота, а в уезде приходилось менее чем по одной голове на десятину земли. Естественной причиной слабого развития животноводства был недостаток лугов. На уровень развития животноводства в уезде негативное влияние оказали последствия восстания 1863–1864 гг. и дискриминационные

***Таблица 1.*** Данные по Брестскому уезду на 1866 г. [1, 47–63] (площадь дана в десятинах)

| Уезд | Число жителей | Общая площадь | Поля | Луга | Площадь, занятая лесом | Количество скота |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Брестский | 90 340 | 438 451 | 202 056 | 66 317 | 111 229 | 193 700 |
| Гродненский | 118 523 | 3 932 825 | 183 467 | 32 015 | 144 390 | 140 045 |
| Кобринский | 105 556 | 464 150 | 183 321 | 129 201 | 90 552 | 168 798 |
| Пружанский | 70 000 | 350 162 | 115 970 | 48 074 | 150 452 | 96 860 |
| Волковысский | 77 793 | 366 552 | 206 586 | 37 094 | 90 605 | Нет данных |
| Слонимский | 115 980 | 652 416 | 237 280 | 95 728 | 254 576 | Нет данных |

***Ковалёва Наталья Николаевна**, профессор кафедры социально-политических и исторических наук Брестского государственного технического университета.*
*Беларусь, БрГТУ, 224017, г. Брест, ул. Московская, 267.*



Репозиторий БрГТУ